ЮБІЛЕЙ



Дыхае песняй

Сустракаюцца ў жыцці цудоўныя людзі, ад іх ідуць вялікая сардэчная цеплыня, душэўная дабрыня. Сярод іх — вядомы гродзенскі кампазітар, былы кіраўнік дзіцячага ўзорнага ансамбля «Гарадзенскія дударыкі» Яўген Канстанцінавіч Петрашэвіч. Прыхільнікі яго таленту называюць мастака чалавекам вялікага ўлюбёнага сэрца. Як слушна заўважыў хтосьці з сяброў кампазітара, маўляў, яму мала проста дыхаць, ён выдыхае паветра разам з песняй. І песня стала сэнсам яго жыцця і яго самога.

Нарадзіўся гэты дасціпны і таленавіты майстра ў песеннай вёсцы Падбараны на Мастоўшчыне, дзе любяць іскрысты жарт, спевы і танцы. З ранняга маленства хлопчыка захапляла народная песня. Маці Вольга Васільеўна валодала цудоўным голасам, бацька добра іграў на гармоніку. Аднавяскоўцы захапляліся спевамі яго маці, некаторыя нават плакалі.

Ён рос у шчырай інтэлігентнай сям'і, глыбока ўлюбёнай у народную песню і музыку. Іх чароўныя гукі запалі ў душу з калыскі. Іншага лёсу юнак і не мог выбраць, ён звязаў яго з музыкай. Неўзабаве здольны хлопец паступае ў Гродзенскую музычную школу. Пасля яе паспяховага заканчэння вучыцца ў Мінскім музычным вучылішчы па спецыяльнасцях «баян» і «дырыжыраванне». Пасля вяртання ў Гродна яго цалкам паглынае актыўная творчая і педагагічная дзейнасць. Музыкант і кампазітар вярнуўся да сваіх былых вытокаў. На працягу 18 гадоў дзеліцца сваім талентам і ведамі з моладдзю ў музычнай школе, дзе некалі сам вучыўся. Ён выкладае баян і кампазіцыю, адкрывае клас цымбалаў, арганізуе інструментальны квінтэт, з якім паспяхова выступае ў Мінску і Беластоку. Сваё сапраўднае творчае прызнанне Яўген Петрашэвіч адчувае, калі кіруе на працягу пяці гадоў аркестравай групай народнага ансамбля песні і танца «Нёман». Не ў меншай меры спадабалася яму праца з аркестравай групай народнага ансамбля танца «Вянок». Ён ахвяраваў ёй таксама пяць творчых гадоў. Поўны сіл і душэўнай энергіі ў гэтыя гады кампазітар піша на высокім прафесійным узроўні. Яго песні гучаць на канцэртных пляцоўках Гродна, Мінска, Беластока, на радах былога Савецкага Саюза, нават на прэстыжнай сцэне Крамлёўскага Палаца з'ездаў у Маскве.

Гэты рытуальны, глыбока лірычны карагод, як шчырая хвала хлебу, багатаму ўраджаю, руплівым рукам хлебаробаў, з вялікай прыемнасцю пабачылі нядаўна ў горадзе Ваўкавыску на свяце «Дажынкі-2004». Акрылены поспехам у 1987 годзе Яўген Петрашэвіч дабіваецца спаўнення сваёй запаветнай мары — ён стварае вядомы дзіцячы фальклорны ансамбль «Гарадзенскія дударыкі». Гэты ансамбль з народна-песеннымі вытокамі заўважылі і палюбілі. У 1993 годзе творчаму калектыву надаецца высокае званне ўзорнага. Геаграфія яго дзейнасці шырокая: зараз яго ведаюць, душэўна прымаюць не толькі ў родных сценах, але ў Літве, Польшчы, Францыі, Нарвегіі. Больш чым паўстагоддзя творца самаахвярна аддае сябе любімай працы. Ім напісаны сотні шчырых песень і вершаў, лірычных і гумарыстычных. У яго творах пранікнёна, задушэўна ўслаўляецца родная, мілая Беларусь, маляўнічая, непаўторная прыгажосць яе прыроды, рупны гаспадар нашай Бацькаўшчыны — просты чалавек з вясёлым, адкрытым, як і ў самога творцы, характарам. У актыў кампазітара прыймальна кладзецца і тое, што ён адметна выяўляе сваю індывідуальнасць і ў скульптурных формах. Яўген Петрашэвіч дзіўна стварае з каранёў і галінак арыгінальныя вырабы, якія шчодра дорыць сваім сябрам і знаёмым. Ім устаноўлены каля Гудзевіцкага краязнаўчага музея памятны чароўны валун. Таленавіты майстар падараваў грамадзянам дацкага горада Колінга сваю скульптуру «Вікінг». Яўген Петрашэвіч заўсёды [illegible] для максімальнага

лорнымі вытокамі, валодае ярка выражаным нацыянальным каларытам. Многія песні ён стварае на ўласныя словы. Як творца ён вельмі даражыць «мілай беларускай гамонкай», народнымі і нацыянальнымі рытмамі. Піша кампазітар музыку ахвотна і на словы мясцовых аўтараў. Так натхнёна спявае жаночая група ансамбля «Нёман» задушэўную «Бярозаньку» на тэкст гродзенскай паэтэсы Дануты Бічэль. Напісана яна даўно, яшчэ ў 1977 годзе, але даспадобы нам і сёння. Дарэчы, у кампазітара ў актыве ёсць нямала ўдалых песень, прысвечаных гарадам і памятным месцам. Асабліва хвалююць нас такія, як «Замак Мірскі», «Навагрудскі замак», «Варшава — сталіца над Віслай», «Берасцейшчына», «Зальвянка», «Орля», «Люблю горад мой» (пра Масты) і многія іншыя.

Шчырую сыноўнюю любоў да Беларусі пранікнёна, задушэўна перадае Яўген Канстанцінавіч ў надзеленых лірычнай сілай паэтычных радках:

Мой родны край,
Апеты салаўямі,
Прымі паклон,
Што стрэў мяне, як сына.
Мне ў навіну з табою
кожнае спатканне,
Пражытая з табою
кожная хвіліна.

У кампазітара Яўгена Петрашэвіча зайздросны чалавечы і творчы лёс. Ён жыве з поўнай аддачай сіл, таму і выглядае молада і прыгожа са шчырай усмешкай на твары. Пад крылом гэтага мастака і чалавека з яго благаславення выраслі такія вядомыя кампазітары, як Віктар Войцік, Леанід Захлеўны і шэраг музыкантаў: Уладзімір Навасадаў, Барыс Фадзін, Сяргей Міхальчук.

Яўген Канстанцінавіч Петрашэвіч сустракае сваё 75-годдзе на высокім творчым уздыме. За сваю плённую творчую

Іван АДАМОВІЧ

Залатыя каласы

Яўгену Петрашэвічу

У дзяўчыны дзве касы —
Залатыя валасы.
Ззяе спрытненькі сярпочак,
З каласоў на ёй вяночак.
Шле паклоны ніве, сонцу,
Прынямонскае старонцы.
Бавіў час я там не раз
І аб гэтым пойдзе сказ.

Дзядзька — нівы гаспадар,
Меў вялікі Божы дар.
Нібы ў казцы, з той нагоды
Адбываюцца прыгоды.
Жнейкі сталі поле жаці:
— Што за цуды?
Не ўстаяці.
Раздаюцца галасы:
— Залатыя каласы!

І такую маюць моц!
Зачароўваюць —
лепш збоч.
Хто калосся дакранецца,
Той чамусьці засмяецца.
Весялосці не суняць,
Бо ўсім хочацца спяваць.
Сама песня зазвінела,
Бы на крылах, паляцела.

Маладыя запяюць
Жнейкам сілы прыдаюць.
Песня сярданька кранае
І над ніваю лунае:
— Ой, поле маё,
Поле каласістае.
Славім песняй мы
Долю прамяністую.

Незвычайнае красы
Урадзілі каласы.
Урадзілі ўсім на дзіва!
— Хто ж засеяў гэту ніву?
— Дзядзька браў сваю
сявеньку
Ды і сеяў памаленьку.
Весела так паглядаў
Ды на дудачцы іграў.

— Што тут думаць і гадаць?
Усе яго павінны знаць.
Мае кожны прызначэнне —
Гэты сейбіт —
дзядзька Жэня.
Ураджай на полі родзіць
І завуць так у народзе,
Што засеяў ён паволі —
Петрашэвічава поле.

Адшумелі ўжо гады,
Шмат адбеглася вады.
І сказаць яшчэ вам трэба —
Урадлівая тут глеба.
А на ніве б'юць крыніцы,
П'юць ваду з іх маладзіцы.
Каштавалі водар гэты
Знакамітыя паэты.

А анёлы з паднябесся
Светлым ранкам

сам, бацька добра іграў на гармоніку. Аднавяскоўцы захапляліся спевамі яго маці, некаторыя нават плакалі.

Ён рос у шчырай інтэлігентнай сям'і, глыбока ўлюбёнай у народную песню і музыку. Іх чароўныя гукі запалі ў душу з калыскі. Іншага лёсу юнак і не мог выбраць, ён звязаў яго з музыкай. Неўзабаве здольны хлопец паступае ў Гродзенскую музычную школу. Пасля яе паспяхова заканчэння вучыцца ў Мінскім музычным вучылішчы па спецыяльнасцях «баян» і «дырыжыраванне». Пасля вяртання ў Гродна яго цалкам паглынае актыўная творчая і педагагічная дзейнасць. Музыкант і кампазітар вярнуўся да сваіх былых вытокаў. На працягу 18 гадоў дзеліцца сваім талентам і ведамі з моладдзю ў музычнай школе, дзе некалі сам вучыўся. Ён выкладае баян і кампазіцыю, адкрывае клас цымбалаў, арганізуе інструментальны квінтэт, з якім паспяхова выступае ў Мінску і Беластоку. Сваё сапраўднае творчае прызнанне Яўген Петрашэвіч адчувае, калі кіруе на працягу пяці гадоў аркестравай групай народнага ансамбля песні і танца «Нёман». Не ў меншай меры спадабалася яму праца з аркестравай групай народнага ансамбля танца «Вянок». Ён ахвяраваў ёй таксама пяць творчых гадоў. Поўны сіл і душэўнай энергіі ў гэтыя гады кампазітар піша на высокім дыханні знакамітую вакальна-харэаграфічную кампазіцыю «Залатыя каласы» на словы паэта-песняніка Анатоля Астрэйкі. Талент быў узаемна аддзячаны – яна набывае шырокую вядомасць: выконваецца ў розных кутках роднай Беларусі, суседняй Польшчы, у многіх гарадах Еўропы. Яе ўзнагародзілі на Усесаюзным конкурсе ў Маскве, на Міжнародным фестывалі ў Польшчы, на Рэспубліканскім конкурсе ў Мінску. Яна стала лаўрэатам Усесаюзнага конкурсу імя Дзяржынскага, Міжнароднага фестывалю ў Польшчы, Рэспубліканскага конкурсу ў Мінску. Вакальна-харэаграфічная кампазіцыя «Залатыя каласы» стала лаўрэатам Рэспубліканскага конкурсу імя Цёткі,